В конце июля 2002 г. были закончены работы по перевозке сруба церкви в г. Гомель (1 370 элементов здания). 29 апреля 2005 г. накануне Пасхи силами личного состава института МЧС были установлены большой и малый купола, кресты. По заказу прихода в апреле 2006 г. мастерами Жировичского Свято-Успенского монастыря был изготовлен и установлен пятиярусный иконостас. Он был торжественно освящен 25 апреля 2006 г., в канун 20-й годовщины аварии на Чернобыльской АЭС. На мероприятии присутствовали Митрополит Минский и Слуцкий Филарет (Вахромеев), Архиепископ Гомельский и Жлобинский Аристарх (Станкевич). С этого момента в храме ежедневно проходят утренние и вечерние службы. Настоятелем храма до 2014 г. являлся иерей А. Белянко. Сейчас настоятелем храма является И. Ольшанов, который является также городским благочинным [3]. У входа в храм установлена мемориальная доска с перечислением населенных пунктов, которые утрачены после Чернобыльской катастрофы, заложена капсула «Послание будущим потомкам».

В храме действует библиотека, для которой с помощью прихожан и на средства храма приобретены три тысячи печатных изданий, в том их числе собрание старых книг второй половины XIX – начала XX века. При храме действует воскресная школа для детей и взрослых.

Современная приходская жизнь храма, расположенного по адресу: г. Гомель, Речицкий проспект, 44, насыщена и интересна. Ныне на благоустроенной территории Свято-Михайловского храма имеется водосвятная часовня с водопроводом, а в летнее время рядом с ней, с ангельской каменной горки истекает искусственный водопад.

Любовь к своей стране начинается с осознанного чувства и интереса к своей малой Родине. Сейчас много говорят о необходимости сохранения памятников старины, а сотрудники и курсанты Института МЧС и священнослужители сохранили красивое и древнее молитвенное здание. Свято-Михайловский храм занесен в Реестр историко-культурных ценностей Республики Беларусь, ему присвоена 3-я квалификационная категория.

**Список использованных источников**

1. Буйневич, Н. А. Гомельский Свято-Михайловский храм-памятник жертвам Чернобыля / Н. А. Буйневич. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. – 94 с.

2. Личные архивы членов Церковно-Исторической комиссии при Гомельской епархии (ЦИКГЕ) С. В. Цыкунова, Н. Н. Козловой.

3. Ольшанов, И. А. Под сенью Архангела Михаила / И. А. Ольшанов, С. В. Цыкунов. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2019. – 224 с.

## АБ МАНАСКІМ ПОДЗВІГУ І ПРАЦАХ ПРАПАДОБНАЙ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

*Бялевіч А. В., УА МДПУ імя І. П. Шамякіна*

Святасць, духоўная веліч асобы прападобнай Еўфрасінні Полацкай вось ужо дзевяць стагоддзяў перадаюцца ад сэрца да сэрца як у нашай краіне, так і далёка за яе межамі. Нязломнай сілай свайго духу, любоўю да Бога і людзей, асветніцкай дзейнасцю манашка-князёўна на стагоддзі ўпляла ў тканіну гісторыі царквы імкненне да духоўнай прыгажосці.

Прападобная Еўфрасіння нарадзілася Прадслава ў пачатку XII ст. ў сямі полацкага князя Георгія і княгіні Сафіі. З жыцця прападобнай вядома, што гады свайго малалецтва яна прысвячала чытанню Святога Пісання і мела вялікую стараннасць да вучэння. Па дасягненні дванаццацігадовага ўзросту Прадслава адмовілася ад шлюбу і пайшла ў манастыр. Манашка Ніна (Баянус) пісала пра жыццё прападобнай: «Вось каханне, якое мацней за смерць! Вечныя святыя юнацкія парывы, якія, не суадносячыся са звычаямі веку гэтага, шукаюць праўды! Яны насыціліся ля крыніцы праўды» [1, с. 291].

Падчас свяціцельскага служэння на Полацкай кафедры епіскапа Іліі юная пустэльніца пасялілася ў Сафійскім саборы. Лічачы духоўную асвету неад'емнай часткай міласэрнасці і любові да людзей, Святая перапісвала богаслужбовыя кнігі для народа, распаўсюджваючы ў родных землях грамату. У спісе яе жыцця, які датуецца XVI стагоддзем адзначана: «Пачала кнігі пісаць сваімі рукамі, нібы сонечны прамень, адукавала яна зямлю Палоцкую» [2, с.11].

У сне Еўфрасінні з'явіўся анёл Гасподні, які загадаў ёй заснаваць манастыр недалёка ад Полацка, у мястэчку пад назвай Сяльцо. Гэта бачанне паўтарылася яшчэ двойчы. Той жа ноччу з'явіўся біскупу Іллі той жа анёл і сказаў: «…увядзі рабу Божую Еўфрасінню ў царкву Святога Спаса, што на Сяльцы, бо месца тое святое, а яна вартая Царства Нябеснага» [3, с. 12].

МГПУ им. И. П. Шамякина

Атрымаўшы благаславенне біскупа, Прападобная адправілася ў шлях, узяўшы з сабой толькі кнігі і тры хлеба. Прыйшоўшы ў загараднае Сяльцо, яна пасялілася там, і заснавала жаночы манастыр. З цягам часу тут былі пастрыжаныя ў манаства сёстры прападобнай Еўфрасінні: родная – Еўдакія і стрыечная – Еўпраксія.

Стараннасцю прападобнай быў узведзены каменны храм у імя Збавіцеля, які захаваўся да цяперашняга часу. Яго будаўніком быў майстар Ян, які сам прыйшоў да Прападобнай, настаўлены Духам Святым, загадваў яму прыняць удзел у будаўніцтве.

У 1161 годзе па благаславенні прападобнай Еўфрасінні майстар-ювелір Лазар Богша вырабіў для Спаскай царквы Полацкага манастыра напрастольны крыж-каўчэг, у якім знаходзіліся вялікія хрысціянскія святыні: часціца Дрэва Крыжа Гасподняга, кропля крыві Збавіцеля, часціцы камянёў Труны Гасподняй і труны Божай Маці, часціцы мошчаў першамучаніка архідыякана Стэфана, велікамучаніка Панцеляймона і кропля крыві велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага. Крыж, выкананы ў старажытнавізантыйскай тэхніцы, меў кіпарысавую падставу, абабітую дваццаццю дзвюма залатымі і дваццаццю срэбнымі з пазалотай пласцінамі, упрыгожанымі арнаментам, камянямі і жэмчугам, дваццаццю эмалевымі абразкамі.

Непадалёк ад Спаскага манастыра прападобная Еўфрасіння ўзвяла каменную царкву – у гонар Прасвятой Багародзіцы, «і яе стварыўшы, упрыгожыла абразамі і, асвяціўшы, перадала манахам, – і быў манастыр вялікі» [2, с. 17]. Менавіта царквы святая выпрасіла ў Візантыі старажытны Эфескі абраз Прачыстай Панны, напісаны, паводле падання, самім евангелістам Лукой. У 1239 годзе абраз быў перанесены з манастыра ў сабор горада Таропца з нагоды вянчання вялікага князя Аляксандра Неўскага і дачкі князя Полацкага Брачыслава.

Сваю асветную дзейнасць і працу па ўладкаванні манастыроў святая Еўфрасіння сумяшчала з клопатам аб супакаенні князёў, прадухіляючы паміж імі сваркі і звады. Як сведчыць Жыціе XVI стагоддзя, «была яна памочніцай пакрыўджаным, тужлівым – суцяшэннем, голым – адзеннем, хворым – наведваннем, і, проста сказаць, для ўсіх была ўсім» [2, с. 19].

Калі на схіле гадоў прападобная Еўфрасіння вырашыла здзейсніць паломніцтва ў Іерусалім да труны Гасподняй. Святая тройчы прыходзіла пакланіцца Жываноснай труне Гасподняй, і малітва яе была пачутая. 23 мая 1173 года, прычасціўшыся Святых Хрыстовых Тайн, блажэнная Еўфрасіння спачыла. Цела было пахавана ў манастыры прападобнага Феадосія Вялікага,

Праз чатырнаццаць гадоў, калі Іерусалім захапіў султан Салах-ад-Дзін, манахі рускага Багародзіцкага манастыра, узялі з сабой нятленныя мошчы полацкай князёўны і перавезлі іх у Кіева-Пячэрскую Лаўру. У перыяд валадарання імператара Мікалая II, у 1910 годзе, святыя мошчы прападобнай Еўфрасінні былі перанесены ў заснаваны ёю Спаскі манастыр у Полацку. Тут яны спачываюць і ў цяперашні час «нятленнем і цудамі сведчачы ўсім пра праўдзівасць праваслаўнай веры, пра любоў да Бога, якая мацней за смерць, аб вялікай адвазе Святой, хадайнічае за нас прад Госпадам» [2, с. 20].

Сёння спяшаюцца да ўгодніцы Божай сучасныя паломнікі і турысты, багатыя і бедныя, шчаслівыя і няшчасныя. Яны звяртаюцца да Прападобнай Еўфрасінні ў сваіх малітвах, і святая ўгодніца на гэтыя малітвы адказвае, умацоўваючы веру людзей, іх здольнасць ісці за Хрыстом. Для многіх, што прыязджаюць у Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр, ён становіцца месцам духоўнага заспакаення, месцам сустрэчы з Богам.

**Список использованных источников**

1. Полоцкое Радование: Свято-Евфросиниевские торжества 1910 года / [концепция и тексты: монахиня Сергия (Бульчик) и др.]. – Полоцк : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь, 2010. – 437 с.

2. Житие преподобной матери нашей Евфросинии, игумении и княжны Полоцкой / [работа над текстом и примеч.: монахиня Сергия (Бульчик); допущено к изданию Издательским советом БПЦ. – Полоцк : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь, 2012. – 23 с.

3. Сарабьянов, В. Д. Спасо-Преображенская церковь Евфросиньева монастыря и ее фрески / В. Д. Сарабьянов. – Изд. 2-е. – М. : Северный паломник, 2009. – 225 с.

## ИЗУЧЕНИЕ МОЗЫРЩИНЫ В XIX – НАЧАЛЕ XX В.

***Варнава З. С., Манько А.А., УО МГПУ имени И.П. Шамякина***

Мозырское Полесье долгое время оставалось одним из самых неизученных регионов Беларуси. «Для многих из нас знакомее страна африканских дикарей, посещенных миссионером Лингвистоном, нежели белорусское Полесье. Это почти Америка в Европе, ожидающая своего Колумба», – писал в XIX в. И. Эремич [10; с. 107]. «Один из самых глухих,



МГПУ им. И. П. Шамякина